ТЭСТАВЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

1. Назавіце самую старажытную кнігу, знойдзеную на тэрыторыі Беларусі (2 балы)
   а) Аповесць мінулых часоў
   **б) Тураўскае евангелле**
   в) Друцкае евангелле
2. Укажыце назву самага старажытнага беларуска-літоўскага летапіса (3 балы)
   а) Хроніка Быхаўца
   б) Іпацеўскі летапіс
   **в) Летапіс вялікіх князёў літоўскіх**
3. У якім са статутаў Вялікага княства Літоўскага была зафіксавана норма запрыгонення селяніна на падставе 10-гадовага прынцыпа даўнасці? (3 балы)
   а) Першым
   б) Другім
   **в) Трэцім**
4. Назавіце горад, які першым на Беларусі атрымаў магдэбургскае права? (1 бал)
   **а) Брэст**
   б) Гродна
   в) Полацк
5. Назавіце помнік заканадаўства, які прадпісваў земскім пісарам Вялікага княства Літоўскага весці ўсю дакументацыю "па-руску" (па-старабеларуску) (1 бал)
   а) Акт Люблінскай уніі
   б) Генрыкавы артыкулы
   **в) Статут ВКЛ 1588 г.**
6. Гісторыі якога беларускага горада прысвечана хроніка Сурты і Трубніцкага? (3 балы)
   **а) Магілёва**
   б) Віцебска
   в) Мінска
7. У якім годзе сойм Рэчы Паспалітай быў упершыню сарваны праз выкарыстанне права "ліберум вета"? (2 балы)
   а) 1648
   б) 1651
   **в) 1652**
8. У якім годзе было забаронена выкарыстанне старабеларускай мовы ў афіцыйным справаводстве Рэчы Паспалітай? (2 балы)
   а) 1686
   **б) 1696**
   в) 1701
9. Укажыце перыяд дзяржаўнага існавання Рэчы Паспалітай (2 балы)
   а) 1569 – 1772
   **б) 1569 – 1795**
   в) 1588 - 1795
10. Назавіце беларускія гарады, у якіх былі знойдзены берасцяныя граматы (2 балы)
   **Віцебск, Мсціслаў**
11. Назавіце імя майстра і год вырабу крыжа Еўфрасінні Полацкай (1 бал)
   **Лазар Богша, 1161**

12. Укажыце назву юрыдычнага помніка, які з'яўляецца галоўнай крыніцай вывучэння старажытнарускага грамадства (1 бал)

**“Руская Праўда”**

13. Пералічыце беларускія гарады, якія фігуруюць у дагаворы Смаленска з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 г. (2 балы)

**Полацк, Віцебск**

14. Укажыце тэрмін, якім у Вялікім княстве Літоўскім абазначаліся даравальныя граматы (3 балы)

**Прывілей**

15. Як называўся дакумент XVI – XIX стст., які фіксаваў павіннасці і падаткі сялян таго ці іншага маёнтка на Беларусі? (2 балы)

**Інвентар**

16. Укажыце назву дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага (1 бал)

**Метрыка Вялікага княства Літоўскага**

17. Назавіце імя вялікага князя і год выдання судзебніка Вялікага княства Літоўскага (2 балы)

**Казімір, 1468**

18. Як перакладаецца слова “унія”? (1 бал)

**Саюз**

19. Назавіце імя караля Рэчы Паспалітай, які зрабіў сваёй галоўнай рэзідэнцыяй Гродна? (2 балы)

**Сэфан Баторый**

20. Назавіце юрыдычны помнік, у якім знайшлі найбольшае ўвасабленне рэформы Чатырохгадовага сойма (1 бал)

**Канстытуцыя 3 мая 1791 г.**